Настаўніцкая газета
№ 4 (8766), 13 студзеня 2023 года

Уступная кампанія

# У аграрыі без экзаменаў



Абітурыенты-мэтавікі, якія выбралі сельскагаспадарчыя спецыяльнасці, будуць залічвацца ўвогуле без уступных іспытаў, паведаміў рэктар Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта Мікалай Раманюк.

— Наваўвядзенні, прадугледжаныя новымі правіламі прыёму, з аднаго боку, павысяць аб'ектыўнасць ацэнкі ведаў абітурыентаў, а з другога — створаць лепшыя ўмовы для паступлення больш падрыхтаванай, матываванай, адоранай і таленавітай моладзі. Менавіта для такой катэгорыі абітурыентаў пашыраны пералік ільгот і прэферэнцый, — нагадаў Мікалай Мікалаевіч.

Па яго словах, сярод найбольш значных навáўвядзенняў, што тычацца аграрных універсітэтаў, — змяненні правіл прыёму на мэтавую падрыхтоўку.

— Для паступлення па мэтавым дагаворы не спатрэбяцца сертыфікаты ні ЦЭ, ні ЦТ, а толькі неабходна будзе рэкамендацыя педагагічнага савета ўстановы адукацыі, якую скончылі абітурыенты. Пры гэтым абітурыенты-мэтавікі, якія выбралі сельскагаспадарчыя спецыяльнасці, будуць залічвацца ўвогуле без уступных іспытаў! Перавагу пры гэтым будуць мець выпускнікі аграрных класаў, якія маюць у дакуменце аб адукацыі адзнакі не ніжэй за 7 балаў па профільных прадметах і змаглі паспяхова прайсці субяседаванне. Адзначу, што колькасць мэтавых месцаў на напрамкі "Сельская гаспадарка", "Ветэрынарыя", "Рыбная гаспадарка" і "Ахова працы" павялічваецца да 70%, хоць раней гэтая лічба складала 60%, — паведаміў рэктар БДАТУ.

Ён перакананы, што мэтавую падрыхтоўку выбіраюць прафесійна арыентаваныя абітурыенты, знаёмыя з сельскім жыццём і сельскагаспадарчай вытворчасцю:

— Мэтавы дагавор дае шэраг пераваг: гарантаваную магчымасць атрымаць першае працоўнае месца і замацавацца на ім, магчымасць загадзя выбраць месца працы, узважыўшы ўсе "за" і "супраць". Да таго ж многія арганізацыі штомесяц даплачваюць да стыпендыі студэнтам-мэтавікам, і, як правіла, памер гэтай даплаты звязаны з паспяховасцю: чым яна вышэйшая, тым больш грунтоўная дадатковая стыпендыя. Гэта выдатны стымул для студэнтаў добра вучыцца, а работадаўца ў выніку атрымлівае больш падрыхтаванага спецыяліста.

Па меркаванні М.М.Раманюка, адбор студэнтаў адбываецца па конкурсе, у якім вызначальную ролю адыгрывае набраны бал. Але за балам не заўсёды відаць абітурыента і яго таленты, уменне працаваць у камандзе, камунікаваць і праяўляць задаткі лідара. Таму характарыстыка дазволіць зірнуць на абітурыента як на асобу, даведацца пра яго здольнасці ў спорце, творчасці, навуцы або грамадскай дзейнасці.

— Думаю, усе новаўвядзенні ўступнай кампаніі аблегчаць жыццё выпускнікам школ. Ім не давядзецца хвалявацца двойчы: пры здачы выпускных экзаменаў у школе і пры праходжанні ЦТ пасля яе заканчэння. Прынамсі, па беларускай ці рускай мове і адным з профільных прадметаў выбранай спецыяльнасці яны здадуць цэнтралізаваныя экзамены ў перыяд навучання. У далейшым трэба будзе рыхтавацца да ЦТ толькі па адным прадмеце. Вынік ЦЭ паўплывае як на сярэдні бал атэстата, так і на конкурсную сітуацыю пры паступленні ва УВА. Ён аб'ектыўна і незалежна ацэніць не толькі веды выпускніка, але і старанні педагога і, напэўна, пасадзейнічае больш якаснай падрыхтоўцы школьнікаў. Увядзенне ЦЭ павысіць таксама і адказнасць за выбар будучай прафесіі, падштурхне патэнцыяльных абітурыентаў больш узважана падыходзіць да выбару будучай сферы дзейнасці, а ўстановы вышэйшай адукацыі — больш якасна праводзіць прафарыентацыйную работу сярод моладзі, — рэзюмаваў рэктар БДАТУ.

**Запісала Вольга АНТОНЕНКАВА.**
**Фота БелТА.**